І.Б. Лапцёнак,
прарэктар па вучэбнай рабоце ДУА «Інстытут культуры Беларусі»,
кандыдат філалагічных навук

# Дадатковая адукацыя дарослых у сферы культуры ў кантэксце сучасных адукацыйных трэндаў

Адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь адносіцца да прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі, з'яўляецца асновай для росту прафесійных супольнасцей, гарантам пабудовы высокаразвітай дзяржавы, адной з найбольш значных крыніц культурнага, духоўнага і інтэлектуальнага ўдасканалення асобы і грамадства.

У сувязі з павышэннем узроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, інтэнсіфікацыяй працэсаў інфарматызацыі, ростам навукаёмістых вытворчасцей, узмацненнем канкурэнцыі, набліжэннем да сусветных стандартаў асаблівую запатрабаванасць набывае новы трэнд у функцыянаванні сістэмы адукацыі — *канцэпцыя бесперапыннай адукацыі* («навучанне праз усё жыццё»). Імкненне да прафесійнага ўдасканалення, укаранення новых напрамкаў дзейнасці, інавацыйных тэхналогій, асваення новых перспектыўных прафесій выклікае неабходнасць у пастаянным удасканаленні, атрыманні новых ведаў і навыкаў на працягу жыцця.

Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2030 г. вызначае, што «ў фарміраванні інавацыйнай эканомікі і яе канкурэнтнага асяроддзя адукацыйная сістэма павінна забяспечыць адпаведнасць атрыманых ведаў і навыкаў хутказменлівым патрабаванням з боку грамадства і эканомікі, тэхнікі і тэхналогій, развіццю асабістай ініцыятывы і адаптаванасці чалавека, дзякуючы якім пашыраюцца яго магчымасці генерыраваць ідэі і інавацыі» [13, с. 27][1].

Шырокія магчымасці для гэтага адкрывае *дадатковая адукацыя дарослых*[2].

Асноўныя вектары функцыянавання дадатковай адукацыі дарослых, якія існуюць у сусветнай практыцы, распрацаваны на аснове рашэнняў міжпарламенцкай асамблеі СНД «Аб адукацыі дарослых» (1997) і прынятага ў яе рамках аднайменнага мадэльнага закона, Міжнароднай канферэнцыі пад эгідай ААН па праблемах адукацыі дарослых (Гамбург, 1997) і прынятай на ёй дэкларацыі аб навучанні дарослых,

[1] Тут і далей пераклад аўтара артыкула.
[2] Тут і далей — ДАД.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агульнаеўрапейскага Мемарандума бесперапыннай адукацыі (2000), Міжнароднай канферэнцыі па праблемах адукацыі дарослых (Дамаск, 2000) і прынятага ёю «Прызыву да дзеянняў у сферы пісьменнасці і адукацыі дарослых для ўсіх».

У Выніковай дэкларацыі 6-й міжнароднай канферэнцыі ЮНЕСКА «CONFINTEA VI» падкрэсліваецца, што «адукацыя дарослых з'яўляецца ключавым кампанентам цэласнай сістэмы навучання і адукацыі на працягу жыцця» [1, с. 5].

У тэорыі і практыцы бесперапыннай адукацыі сфармуляваны прынцыпы, на аснове якіх функцыянуе і сістэма ДАД:

новыя базавыя веды і навыкі для ўсіх;

павелічэнне інвестыцый у чалавечыя рэсурсы;

інавацыйныя методыкі выкладання і навучання;

новая сістэма ацэнкі атрыманай адукацыі;

развіццё настаўніцтва і кансультавання;

набліжэнне адукацыі да дома з дапамогай сеткі навучальных, кансультацыйных пунктаў і інфармацыйных тэхналогій.

У адпаведнасці з практыкай, якая склалася ў міжнароднай адукацыйнай супольнасці, вылучаюцца наступныя віды адукацыйнай дзейнасці, якія адносяцца да адукацыі дарослых:

фармальная адукацыя, якая адбываецца ў фармальным адукацыйным асяроддзі і звычайна завяршаецца выдачай дыплома, сертыфіката ці даведкі аб навучанні;

нефармальная адукацыя, што адбываецца ва ўстановах культуры, адукацыі і грамадскіх арганізацыях (культурна-адукацыйныя праграмы, клубы, гурткі і інш.);

інфармальная адукацыя — індывідуальная пазнавальная дзейнасць чалавека на працягу жыцця.

Сістэма дадатковай адукацыі дарослых ставіць акцэнт на *актыўнасці атрымліваемых ведаў і наяўнасці прадуманай зваротнай сувязі*.

Згодна тэорыі Дэвіда Колба навучанне – гэта сацыяльны працэс, і ён не павінен зводзіцца да механічнай «засваяльнасці» інфармацыі, якая прапануецца ў ходзе выкладання, а павінен даваць «нешта, што мае адносіны да таго, што самі людзі прыўносяць у вучэбную сітуацыю з уласнага жыццёвага вопыту і ўласных спосабаў рэагавання на новую інфармацыю і новыя сітуацыі» [15, с. 26].

Асноўным суб'ектам ДАД з'яўляецца дарослы навучэнец. Існуюць пэўныя *асаблівасці дарослых навучэнцаў*, якія іх вылучаюць сярод іншых катэгорый, выяўленыя падчас назіранняў і сацыялагічных даследаванняў [15, с. 14]:

дарослыя навучэнцы самастойныя і самакіруемыя. Ім падабаецца самім планаваць сваю дзейнасць і актыўна ўдзельнічаць у працэсе навучання;

дарослыя маюць пэўны жыццёвы вопыт і веды. І таму зыходную платформу для іх навучання трэба будаваць на іх вопыце і перавагах;

дарослыя арыентаваны на мэту, і таму іх навучанне з'яўляецца эфектыўным, калі створаны выразныя арыенціры. Яны імкнуцца працаваць над праектамі і тэмамі, якія адлюстроўваць іх інтарэсы;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дарослыя арыентаваны на актуальнасць атрымліваемай інфармацыі, і, як правіла, адносяцца да навучання з практычнага пункту гледжання.

Сістэма ДАД у Беларусі заснавана больш за 50 гадоў таму назад. З прыняццем у 2011 г. Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (далей — Кодэкс) паняцце «дадатковая адукацыя дарослых» упершыню было сфармулявана на заканадаўчым узроўні і вызначана артыкулам 240 як «від дадатковай адукацыі, накіраваны на прафесійнае развіццё слухача, стажора і задавальненне іх пазнавальных патрэбнасцей» [6]. У раздзеле XIV «Дадатковая адукацыя дарослых» сфармуляваны ключавыя мэты, задачы і прынцыпы сістэмы ДАД, вызначаны ўстановы адукацыі і ўдзельнікі адукацыйнага працэсу.

На сучасным этапе ДАД уключае рэалізацыю 12 адукацыйных праграм. У залежнасці ад сваёй спецыфікі адукацыйныя праграмы ДАД накіраваны на прафесійнае ўдасканаленне работнікаў; прысваенне новай кваліфікацыі; засваенне новых метадаў, тэхналогій і элементаў прафесійнай дзейнасці; паглыбленне ведаў і набыццё практычных прафесійных навыкаў; задавальненне пазнавальных запатрабаванняў у пэўнай сферы прафесійнай дзейнасці або галіне ведаў; фарміраванне прафесійных навыкаў, неабходных для выканання работнікамі арганізацый сваіх службовых абавязкаў; маральнае, культурнае і фізічнае развіццё асобы, фарміраванне навыкаў, неабходных у паўсядзённым жыцці і інш.

Адметнай асаблівасцю сістэмы ДАД у рэспубліцы з'яўляецца ўключэнне ў яе нароўні з установамі адукацыі іншых арганізацый, а таксама індывідуальных прадпрымальнікаў, якім адпаведна з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць.

Згодна Кодэксу да відаў устаноў ДАД аднесены:

акадэмія паслядыпломнай адукацыі;

інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі;

інстытут развіцця адукацыі;

цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

цэнтр падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі рабочых.

У краіне распрацаваны шэраг асобных заканадаўчых актаў, якія вызначаюць *нарматыўна-прававыя падставы функцыянавання ДАД*:

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2011 г. № 954 «Аб асобных пытаннях дадатковай адукацыі дарослых», адпаведна якой зацверджаны: Палажэнне аб парадку прызнання ўстановы дадатковай адукацыі дарослых вядучай установай адукацыі ў галіне; Палажэнне аб бесперапыннай прафесійнай адукацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў; Палажэнне аб бесперапынным прафесійным навучанні па прафесіях рабочых; Палажэнне аб навучальных курсах дадатковай адукацыі дарослых;

Пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь: «Аб зацвярджэнні Палажэння аб вучэбна-метадычным аб'яднанні ў сферы дадатковай адукацыі дарослых» (ад 28.07.2011 г. № 195); «Аб зацвярджэнні Палажэння аб установе дадатковай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыі дарослых» (ад 28.07.2011 г. № 198); «Аб устанаўленні узораў білета слухача і заліковай кніжкі» (ад 12.08.2011 № 225); «Аб зацвярджэнні тыпавых форм дагавораў у сферы адукацыі» (ад 21.07.2011 № 99); «Аб дакументах аб адукацыі, дадаткаў да іх, залатым, сярэбраным медалях і дакументах аб навучанні» (ад 27.07.2011 № 194); «Аб зацвярджэнні Правілаў правядзення атэстацыі слухачоў, стажораў пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых» (ад 24.12.2013 № 135) і інш.

На сённяшні дзень у сістэме ДАД ужо пройдзены пэўны этап рэфармавання, удакладнены класіфікатар спецыяльнасцей, удасканалена інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе, навукова-метадычнае забеспячэнне прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў адукацыі, вызначаны новыя падыходы. Распрацаваныя адукацыйныя стандарты трэцяга пакалення па шэрагу канцэптуальных падыходаў суадносяцца з еўрапейскімі вымярэннямі [8, с. 6].

Асноўнай мэтай ДАД з'яўляецца забеспячэнне адукацыйнай сістэмы работнікамі неабходнай кваліфікацыі і ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці, гатовых да прадуктыўнай дзейнасці. У сувязі з гэтым акцэнт робіцца на якасных зрухах у адукацыйных тэхналогіях, выкарыстанні актыўных метадаў навучання, укараненні новых актуальных напрамкаў дзейнасці.

Сёння ў рэспубліцы распрацаваны праграмныя дакументы, накіраваныя на далейшае развіццё сістэмы ДАД з улікам функцыянавання галін эканомікі.

*Канцэпцыя развіцця педагагічнай адукацыі на 2015—2020 гг.* вызначае прыярытэтныя напрамкі ўдасканалення сістэмы ў сучасных сацыяльна-эканамічных умовах і прагназуе магчымасці павелічэння яе сацыяльнай эфектыўнасці. Для павышэння якасці арганізацыі адукацыйнага працэсу прадугледжана выкарыстанне сучасных інфармацыйных і інавацыйных педагагічных тэхналогій, пашырэнне праблемна-даследчай базы і інтэграцыя вучэбна-навукова-інавацыйнага патэнцыялу адукацыйных і навукова-метадычных устаноў, пераход на кластарную мадэль развіцця [8, с. 18].

У *Канцэпцыі інфарматызацыі сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г.* пазначаны ў ліку прыярытэтных напрамкаў: распрацоўка электронных адукацыйных рэсурсаў; забеспячэнне сеткавага ўзаемадзеяння ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, распаўсюджванне дыстанцыйнай формы атрымання адукацыі [7, с. 11—13].

Падпраграмай 7 «Развіццё сістэмы дадатковай адукацыі дарослых» *Дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2016—2020 гг.*, прадугледжваецца вырашэнне задач па ўдасканаленню зместу ДАД у адпаведнасці з запатрабаваннямі галін эканомікі; забеспячэнне разнастайнасці, варыятыўнасці і гібкасці вучэбных планаў і вучэбных праграм; прымяненне сучасных адукацыйных тэхналогій, іх аператыўны водгук на запатрабаванні рынку адукацыйных паслуг. Мэтавымі паказчыкамі выканання задач пазначаны ўдзельная вага абноўленых адукацыйных стандартаў спецыяльнасцей перападрыхтоўкі; удзельная вага ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы павышэння



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў у дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі [2, с. 47].

Разам з тым, не губляюць сваёй актуальнасці *пытанні эфектыўнасці сістэмы ДАД у канкрэтных сферах прафесійнай дзейнасці* ў сувязі з неабходнасцю развіцця кадравага патэнцыялу, правядзення аптымізацыі, змяненнем інфармацыйнай інфраструктуры, укараненнем новых тэхналогій, удасканаленнем педагагічнай практыкі ўстаноў адукацыі і метадычных распрацовак галіны.

На сённяшні дзень адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў сферы культуры рэспубліканскага ўзроўню рэалізуюцца ў дзяржаўнай установе адукацыі «Інстытут культуры Беларусі»[3], а таксама на факультэтах павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі (далей — факультэты) устаноў адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў». Ва ўсіх названых установах рэалізуецца адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, а павышэнне кваліфікацыі — у Інбелкульце, на факультэтах Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Пры гэтым за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту павышэнне кваліфікацыі рэалізуецца ў Інбелкульце і на факультэце Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, а перападрыхтоўка — толькі ў Інбелкульце.

Сістэма ДАД рэгіянальнага ўзроўню дзейнічае ва ўстановах адукацыі, размешчаных у гарадах абласнога падпарадкавання: ДУА «Брэсцкі абласны цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры»; ДУА «Віцебскі абласны цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры»; Аддзяленне павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў устаноў культуры і мастацтва УА «Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф. Сакалоўскага»; Аддзяленне павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў устаноў культуры і мастацтва УА «Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў»; Аддзяленне павышэння кваліфікацыі УА «Магілёўскі дзяржаўны бібліятэчны каледж імя А.С. Пушкіна».

Інбелкульт з'яўляецца адзінай у краіне спецыялізаванай установай ДАД у сферы культуры рэспубліканскага ўзроўню. Нягледзячы на тое, што інстытут быў створаны толькі ў 2010 г., ён атрымаў у спадчыну структуру і змястоўныя напрамкі работы ад установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры», заснаванай у 1991 г. у выніку аб'яднання трох устаноў — Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы, Рэспубліканскага метадычнага кабінета навучальных устаноў культуры і мастацтва, Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры. Пачатак дзейнасці Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў

[3] Тут і далей — Інбелкульт.





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры і Рэспубліканскага метадычнага кабінета навучальных устаноў культуры і мастацтва адносіцца да 1940-х гг.

Сёння дзейнасць Інбелкульта напрамую звязана з дзяржаўным заказам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў культуры, навукова-метадычным забеспячэннем развіцця культуры. Інбелкульт — адзіная ўстанова ў сферы культуры, якая ажыццяўляе перападрыхтоўку спецыялістаў на бюджэтнай аснове, што дазваляе аператыўна рэагаваць на запатрабаванні рэгіёнаў, садзейнічае хуткай ліквідацыі дэфіцыту кадраў культуры. Інстытут ажыццяўляе арганізацыю і правядзенне кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне (пацвярджэнне) вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі для педагагічных работнікаў, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі мастацкага профілю (дзіцячых школ мастацтваў) у галіне музычнага, эстраднага, тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну, народнай творчасці.

Штогод у Інбелкульце праходзяць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку больш за 40 % ад колькасці кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія засвоілі адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ва ўстановах адукацыі сферы культуры. У Інбелкульце павышаюць сваю прафесійную кваліфікацыю такія катэгорыі работнікаў устаноў культуры, як кіраўнікі і спецыялісты гарадскіх і раённых аддзелаў культуры, клубаў, палацаў і дамоў культуры, метадычных цэнтраў народнай творчасці, бібліятэк, музеяў, прадпрыемстваў кінавідэапракату, педагагічныя работнікі (дырэктары, намеснікі дырэктараў, настаўнікі, канцэртмайстры) дзіцячых школ мастацтваў і выкладчыкі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, кіраўнікі тэатральна-відовішчных устаноў.

Існуючая сёння сістэма ДАД у сферы культуры, у цэлым паспяхова выконваючы свае асноўныя функцыі, патрабуе ўдасканалення дзейнасці, звязанай з *фарміраваннем кадравага патэнцыялу*:

па-першае, з узрослымі патрабаваннямі да работы кадраў у новых сацыяльна-эканамічных умовах;

па-другое, з неабходнасцю дакладнага выканання дзеючага заканадаўства, якім рэгламентаваны кваліфікацыйныя патрабаванні да займаемай пасады, у тым ліку звязаных з засваеннем новых тэхналогій і напрамкаў работы ў канкрэтных відах дзейнасці ў сферы культуры;

па-трэцяе, з новымі тэндэнцыямі і інавацыйнымі падыходамі да ДАД, у аснове якіх знаходзіцца як свабодны выбар работніка, дэтэрмінаваны ўласнай матывацыяй, так і задавальненне патрэб дзяржаўнага заказу кадраў культуры.

Да праблемных пытанняў ДАД адносяцца пытанні *комплекснага забеспячэння сістэмы*, у тым ліку, забеспячэння якасці распрацоўкі і рэалізацыі адукацыйных праграм, інфармацыйна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу, стварэння неабходнай рэсурснай базы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сувязі з гэтым уяўляецца важнай задача *вызначэння ўмоў і фактараў, якія ўплываюць на эфектыўнасць адукацыйнага працэсу*, фарміраванне неабходнага спектра адукацыйных паслуг. Для забеспячэння стабільнасці і эфектыўнасці работы сістэмы адукацыі пры распрацоўцы сучасных адукацыйных праграм неабходны аналіз і прагноз адукацыйных патрэбнасцей дарослага насельніцтва, прафесійнай супольнасці, правядзенне маніторынгу запатрабаванняў арганізацый у змяненні прафесійна-кадравага патэнцыялу, зыходзячы з адпаведных зменаў знешняга асяроддзя і дзяржаўнага заказу. На аснове патрэбнасцей у навучанні, выяўленых з дапамогай сістэмы маніторынгу, ствараюцца адукацыйныя праграмы ДАД.

Найбольш важная частка рэалізацыі гэтых праграм — укараненне новых падыходаў. Сёння найбольш запатрабаваным уяўляецца *практыкаарыентаваны падыход*, накіраваны на фарміраванне ў слухачоў прафесійных, агульнакультурных, сацыяльна-значных кампетэнцый, з дапамогай набыцця ведаў, уменняў, навыкаў і вопыту пэўнай практычнай дзейнасці, шляхам увядзення у атмасферу прафесійнага асяроддзя, генерацыі прафесійна-арыентаваных тэхналогій.

Пры гэтым важную ролю выконвае *фарміраванне пэўных кампетэнцый*. Наяўнасць прафесійных ведаў у канкрэтных відах дзейнасці — аснова эфектыўнай работы і якаснай рэалізацыі стратэгічных планаў развіцця ўстаноў і галіны ў цэлым [9, с. 115]. У працэсе навучання слухач павінен авалодаць як «скразнымі» (агульнымі) ведамі і ўменнямі, так і адмысловымі (вузкапрафесійнымі) уменнямі і навыкамі. Важным з’яўляецца таксама фарміраванне ў працэсе навучання асобасных якасцей, ад якіх таксама залежыць эфектыўнасць работы спецыяліста [4].

Значны элемент практыкаарыентаванага падыходу ў ДАД — сувязь з базамі практыкі.

У мэтах павышэння якасці адукацыі ў Інбелкульце зацверджаны «Пералік базавых пляцовак для правядзення выязных аўдыторных заняткаў для слухачоў дзяржаўнай установы адукацыі «Інстытут культуры Беларусі»», у які ўвайшлі 57 устаноў культуры і адукацыі. На іх базе праводзяцца практычныя заняткі, майстар-класы, трэнінгі, заняткі са слухачамі па абмену вопытам. Практычны кампанент у Інбелкульце складае больш за 70 % ад агульнай колькасці вучэбных гадзін. Колькасць заняткаў для груп павышэння кваліфікацыі на выездзе, як правіла, складае каля 50 % ад агульнай колькасці вучэбных гадзін, для некаторых катэгорый слухачоў пры засваенні пэўных праграм — 60—80 %. Навучанне кіраўнікоў і спецыялістаў у сістэме ДАД паступова набывае мабільны характар.

Так, работнікі музеяў асвойваюць змест адукацыйных праграм у прасторы экспазіцыйных, выставачных залаў, майстэрань, музейна-педагагічных зон Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж», Музея «Замкавы комплекс “Мір”», Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Беларускага дзяржаўнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музея народнай архітэктуры і побыту, Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, Музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь, Музея гісторыі горада Мінска і інш.

Практычныя заняткі для работнікаў бібліятэк праходзяць у спецыялізаваных залах і фондасховішчах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінск, Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінск, Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна, Навуковай бібліятэкі ўстановы адукацыі «Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт», Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі і інш.

Майстар-класы для работнікаў устаноў адукацыі сферы культуры арганізуюцца ў Рэспубліканскай гімназіі-каледжы пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным харэаграфічным каледжы, Мінскім дзяржаўным мастацкім вучылішчы імя А.К. Глебава, Мінскім дзяржаўным музычным вучылішчы імя М.І. Глінкі, Мінскім дзяржаўным каледжы мастацтваў, Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжы мастацтваў, гімназіі-каледжы мастацтваў імя І.В. Ахрэмчыка, дзіцячай музычнай школе мастацтваў № 1 імя Л.П. Александроўскай, дзіцячых музычных, мастацкіх, харэаграфічных школах мастацтваў г. Мінск.

Работнікі тэатральна-відовішчных арганізацый вывучаюць на месцах вопыт работы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага, Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, Новага драматычнага тэатра.

Важна разумець, што базы практыкі — гэта не плошчы для правядзення заняткаў, а партнёры ўстаноў адукацыі, ад актыўнасці, адкрытасці і гатоўнасці якіх да сумеснага дыялогу залежыць нямала. Стаць базай практыкі — важная і ганаровая місія, якая сведчыць аб паспяховасці і эфектыўнасці працы дадзенай установы, кірунак дзейнасці якой уключаны ў праграму ДАД з мэтай распаўсюджвання перадавога вопыту работы.

*Актуальнасць і інавацыйнасць зместу адукацыйных праграм* прадвызначаюць цікавасць да іх з боку прафесійнай супольнасці, а інтэрактыўнасць і мабільнасць адукацыйнага працэсу садзейнічаюць больш высокаму ўзроўню іх засваення.

Паспяховая рэалізацыя адукацыйных праграм прадугледжвае ўдасканаленне сістэмы навукова-метадычнага і інфармацыйна-метадычнага забеспячэння адукацыйнай дзейнасці.

Фактарам поспеху ДАД з’яўляецца таксама *прафесійная кампетэнтнасць педагогаў*, іх педагагічнае майстэрства і крэатыўнасць.

Немалаважную ролю пры гэтым можа выконваць дзейнасць творчых школ, лабараторый, эксперыментальных пляцовак, спецыялізаваных аўдыторый. Напры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

клад, у 2016 г. у Інбелкульце з мэтай профільнай падтрымкі і стварэння дадатковых магчымасцей для ўдасканалення майстэрства спецыялістаў сферы культуры была адкрыта этналабараторыя. Асноўныя задачы, якія дапамагае вырашаць этналабараторыя: засваенне сучасных тэхнік работы з этнаматэрыялам, новых методык інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнай спадчыны, асэнсаванне беларускай традыцыйнай культуры ў сусветным кантэксце, развіццё міжкультурных сувязей. У аснову прадметнай часткі мабільнай экспазіцыі, якая размешчана ў спецыялізаванай аўдыторыі, пакладзены калекцыі народных інструментаў, побытавых рэчаў і строяў больш чым з 15 краін свету. Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інбелкульта, педагагічных работнікаў аддзела традыцыйнай культуры і аматарскай творчасці, сектара сацыякультурнай дзейнасці слухачы, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі, навучальных курсаў, перападрыхтоўкі па спецыяльнасці «Культурна-адпачынкавая дзейнасць», атрымліваюць новыя веды і практычныя навыкі. У творчай лабараторыі праводзяцца майстар-класы, семінары, круглыя сталы, трэнінгі па музычна-адукацыйнай дзейнасці, прыкладных рамёствах, народнай сцэнаграфіі, харэаграфіі і інш. Слухачы атрымліваюць магчымасць удзельнічаць у арганізацыі рэканструкцый свят і абрадаў на аснове аналізу аўтэнтычных матэрыялаў, з мэтай далейшага распаўсюджвання практычнага вопыту ва ўстановах, дзе яны працуюць.

Да *асноўных задач удасканалення сістэмы ДАД у сферы культуры*, заснаваным на абагульненні існуючых тэндэнцый у развіцці адукацыі, сёння можна аднесці наступныя:

правядзенне маркетынгавых даследаванняў запатрабаванняў у галіне, пастаянны маніторынг рынку працы;

удасканаленне навукова-метадычнага, інфармацыйнага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння сістэмы;

укараненне новых адукацыйных тэхналогій, дыстанцыйнага навучання, стварэнне кантэнту віртуальнага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя;

пашырэнне маштабаў міжнароднага супрацоўніцтва.

Змест вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм ДАД вызначаецца кваліфікацыйнымі патрабаваннямі да катэгорый работнікаў, а таксама асноўнымі перспектыўнымі напрамкамі развіцця галіны. Аднак, як паказваюць вынікі аналізу кадравай сітуацыі на аснове дзяржаўных статыстычных назіранняў і даныя маніторынгу, якія выяўляюць патрэбнасці ў навучанні па адукацыйных праграмах перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, існуюць праблемы ў забеспячэнні галіны пэўнымі катэгорыямі спецыялістаў [12, с. 234—235].

На сучасным этапе ад установы ДАД патрабуецца цесная сувязь з арганізацыямі культуры рэгіёнаў, актыўнае выяўленне, сістэмнае абагульненне і распаўсюджанне перспектыўнага вопыту іх работы ў працэсе рэалізацыі адукацыйных праграм.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Актуальным застаецца пытанне ўдасканалення каардынацыі дзейнасці ўстаноў, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў сферы культуры, з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ў частцы планавання і рэалізацыі адукацыйных праграм. Сёння гэта супрацоўніцтва наладжана на ўзроўні пэўных устаноў, аднак неабходна распрацоўка агульнага алгарытму, які дазволіць паставіць пытанні ўзгаднення і каардынацыі на сістэмную аснову.

Важнай задачай з'яўляецца пастаяннае абнаўленне зместу адукацыйных праграм, укараненне новых педагагічных тэхналогій у адукацыйны працэс [10, с. 74—79]. Яе вырашэнню, на наш погляд, будзе спрыяць рэалізацыя наступных напрамкаў:

персаналізацыя адукацыі: выкарыстанне індывідуальнага вопыту слухачоў; распрацоўка case study, падбор інструментаў навучання пад канкрэтныя практычныя задачы; навучанне самаменеджменту, распрацоўка праграм самаразвіцця [3, с. 20—24];

выкарыстанне модульных і праектных тэхналогій: распрацоўка праграмных модуляў; адукацыйных траекторый, якія ствараюць комплексныя праграмы, маршруты навучання; уключэнне праектнага метаду ў адукацыйны працэс [11, с. 3—11];

развіццё электроннай адукацыі і пашырэнне розных відаў сеткавага супрацоўніцтва: стварэнне on-line платформы навучання; уключэнне дыстанцыйных інтэрактыўных форм і метадаў навучання ў адукацыйны працэс; правядзенне відэаканферэнцый, вебінараў, on-line сустрэч і прэзентацый [14, с. 27—47].

Асновай для ўдасканалення сістэмы ДАД з'яўляецца таксама ўмацаванне інтэграцыі паміж вытворчасцю, навукай і сістэмай адукацыі, у тым ліку шляхам правядзення навуковых даследаванняў, прысвечаных мадэрнізацыі дадатковай прафесійнай адукацыі ва ўмовах дынамічнага знешняга асяроддзя. За мяжой створаны міжнародныя і нацыянальныя цэнтры, у навуковую кампетэнцыю якіх уваходзіць вывучэнне праблем адукацыі дарослых: Інстытут адукацыі UNESCO (Германія), Міжнародны інстытут планавання адукацыі (Францыя), Міжнародны інстытут адукацыі (ЗША), Швейцарская арганізацыя адукацыі дарослых, Нацыянальны інстытут адукацыі дарослых (Вялікабрытанія), Міжнародны інстытут педагагічных даследаванняў (Германія) і інш.

У Рэспубліцы Беларусь адным з паказчыкаў ажыццяўлення навуковага падыходу ў распрацоўцы і рэалізацыі адукацыйных праграм з'яўляецца ўкараненне вынікаў навуковых даследаванняў у адукацыйны працэс.

Планаванне навукова-даследчых работ адбываецца ў адпаведнасці з запытамі сферы культуры і прыярытэтамі дзяржаўнай палітыкі. Мэта плануемых Інбелкультам навукова-даследчых работ — распрацоўка навукова-практычных рэкамендацый па захаванню і павелічэнню культурнага патэнцыялу краіны, яго рацыянальнаму выкарыстанню, пашырэнню магчымасці інтэграцыі беларускай культуры ў сусветную, павышэнню якасці адукацыі ў сферы культуры, укараненню стандартаў якасці паслуг, мадэляў кіравання культурай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У перыяд 2013—2015 гг. Інбелкультам арганізаваны навукова-даследчыя работы па пытаннях вывучэння запатрабаванняў кадраў культуры ў павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы кіруючых работнікаў і спецыялістаў, павышэнні якасці ДАД у сферы культуры [5]. Аналітычныя матэрыялы пакладзены ў аснову фарміравання кантынгенту слухачоў, распрацоўкі зместу адукацыйных праграм, метадычных дапаможнікаў і рэкамендацый.

З улікам высноў навукова-даследчых работ для павелічэння эфектыўнасці функцыянавання галіны праграмы ДАД будуць накіраваны на вывучэнне новых упраўленчых мадэляў, актывізацыю міжкультурных камунікацый, пашырэнне інавацыйнай кампетэнтнасці, рэалізацыю прынцыпу апераджальнага развіцця, заснаванага на ўліку тэндэнцый генерацыі культурных працэсаў у рэгіёнах Беларусі.

Адпаведна Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2030 г. прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці ў сферы культуры, якія абумоўліваюць змест праграм ДАД, з'яўляюцца наступныя: захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей, нацыянальна-культурнай самабытнасці і традыцый; інтэграцыя беларускай культуры ў сусветную; усямерная падтрымка таленавітай моладзі ў рэалізацыі новых ідэй і творчых праектаў; фарміраванне экалагічнай культуры; распрацоўка стандартаў якасці паслуг у сферы культуры; развіццё фандрайзінгу і дзяржаўна-прыватнага партнёрства; стварэнне канкурэнтаздольнага культурнага прадукту і яго сістэмная рэпрэзентацыя [13, с. 31—32].

Спіс выкарыстаных крыніц:


1. *Галичин, В.А., Косарева, С.И.* Образование взрослых : основные характеристики и тенденции развития / В.А. Галичин, С.И. Косарева. — М., 2013. — Режим доступа : http://cyberleninka.ru/article/n/osnovnye-harakteristiki-i-tendentsii-razvitiya-obrazovaniya-vzroslyh-v-usloviyah-globalizatsii. — Дата доступа : 20.06.2016.
2. Государственная программа «Образование и молодежная политика» на 2016—2020 гг., утвержденная Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 28.03.2016 г. № 250. — Режим доступа : http://www.government.by/upload/docs/file2b2ba5ad88b5b0eb.PDF. — Дата доступа : 20.06.2016.
3. *Грачев, В.В.* Персонализация образования в условиях глобального перехода к веб-стилю жизни / В.В. Грачев // Экономика образования. — 2012. — № 1. — С. 20—24.
4. *Ибрагимов, Г.И.* Компетентностный подход в профессиональном образовании / Г.И. Ибрагимов // Educational Technology & Society [Электронный ресурс]. — 2007. — № 10 (3). — Режим доступа : http://grouper.ieee.org/groups/ifets/russian/depository/v10_i3/html/3_Ibragimov.htm. — Дата доступа : 20.06.2016.
5. Изучить потребности кадров культуры в повышении квалификации и переподготовке и разработать научно-практические рекомендации по совершенствованию системы дополнительного образования взрослых : науч.-исслед. работа / ГУО «Институт культуры Беларуси». — Гос. реестр НИОКР(Т)Р. — № регистрации: 20132641. — Дата регистрации: 24.12.2013.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. — Мінск : Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэсп. Беларусь, 2011. — Рэжым доступу : http://etalonline.by/?type=text&regnum=hk1100243#load_text_none_1_. — Дата доступу : 20.06.2016.
7. Концепция информатизации системы образования Республики Беларусь на период до 2020 г., утвержденная Министром образования 24.06.2013 г. — Режим доступа : old.edu.bsu.by/sm.aspx?guid=437693. — Дата доступа : 20.06.2016.
8. Концепция развития педагогического образования в Республике Беларусь на 2015—2020 гг., утвержденная Приказом Министра образования от 25.02.2015 г. № 156. — Режим доступа : portal.mspu.by/dok/rasp/koncepciya.rtf. — Дата доступа : 20.06.2016.
9. *Лаптенок, И.Б.* Проблемы и перспективы развития коммуникационных процессов взаимодействия музейной сферы и образования // Первый Национальный форум «Музеи Беларуси» : сб. материалов деловой программы (Гродно, 12—14 октября 2012 г.) / сост., общ. ред. И.Б. Лаптенок. — Минск : Институт культуры Беларуси, 2013. — С. 114—124.
10. *Лапцёнак, І.Б.* Выкарыстанне актыўных форм абмену вопытам у сістэме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў музейных устаноў Беларусі / І.Б. Лапцёнак // Музейная адукацыя і музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь : стан, тэндэнцыі, перспектывы : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. (24 лістапада 2011 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. — Мінск, 2012. — С. 74—79.
11. *Лапцёнак, І.Б.* Метадалогія праектнай дзейнасці // Экспазіцыя ў музейнай прасторы : праектны менеджмент (Музейны сшытак) / уклад., агульн. рэд. І.Б. Лапцёнак. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2012. — С. 3—12.
12. *Лапцёнак, І.Б.* Перападрыхтоўка кадраў сферы культуры як перспектыўны кірунак рэалізацыі кадравай палітыкі / І.Б. Лапцёнак // Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці : Нацыянальная культура ў зменлівым свеце : матэрыялы IV Міжнар. завочнай навук.-практ. канф. (Мінск, 24 снежня 2015 г.) / ДУА «Інстытут культуры Беларусі»; рэдкал.: І.Б. Лапцёнак [і інш.]. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2015. — С. 233—239.
13. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь до 2030 г. — Режим доступа : http://www.economy.gov.by/dadvfiles/001251_55175_NSUR.pdf. — Дата доступа : 20.06.2016.
14. *Стрелкова, И.Б.* Дополнительное профессиональное образование для руководителей и специалистов библиотек : практикоориентированный подход : учеб.метод. пособие для слушателей системы повышения квалификации и переподготовки кадров / И.Б. Стрелкова. — Минск : Беларуская навука, 2016. — 193 с.
15. Учение в течение всей жизни в музеях. Европейский опыт / под ред. Кирстен Гиббс, Маргериты Сани, Джейн Томпсон. — Тула : Ясная Поляна, 2010. — 116 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ